# § 49. Культура Беларусі ў другой палове XVI — XVIII ст.

БАРОКА

ІКАНАПІС РАКАКО

БАТЛЕЙКА ІНТЭРМЕДЫЯ

КЛАСІЦЫЗМ

ШКОЛЬНЫ ТЭАТР

САРМАТЫЗМ

**1. Сарматызм і барока ў беларускай культуры канца XVI — XVIII ст.** У XVII ст. у Рэчы Паспалітай атрымала пашырэнне канцэпцыя сарматызму, згодна з якой уся шляхта — і Польшчы, і ВКЛ — нібыта паходзіла ад ваяўнічых сарматаў і складала адзінае цэлае. Мова сарматаў — польская, таму кожны шляхціц мусіў карыстацца менавіта ёю. Такім чынам, польская мова з'ўлялася прыкметай прыналежнасці да найвышэйшага саслоўя. У выніку ў XVII ст. польская мова атрымала максімальнае пашырэнне сярод шляхты Беларусі і Літвы, што спрыяла яе паланізацыі і разрыву з традыцыямі большасці насельніцтва. Адметнай рысай сарматызму было перакананне шляхты ў поўнай перавазе польскай палітычнай мадэлі, звычаяў і нават адзення над усімі іншымі народамі. Адной з галоўных ідэй гэтай канцэпцыі быў шляхецкі кансерватызм, захаванне недатыкальнымі сваіх прывілеяў і недапушчэнне ніякіх перамен звонку. Негатыўна ўспрымаліся ўсякія змены і рэформы, таму што ўклад Рэчы Паспалітай лічыўся ідэальным.

Сармацкая ідэалогія

Чаму сарматызм набыў папулярнасць і зрабіўся асаблівасцю шляхецкай культуры?

Ад канца XVI ст. галоўным праваднікам ідэй Контррэфармацыі ў ВКЛ выступаў мастацкі стыль



*Партрэт Станіслава Антонія Шчукі. 1735–1740 гг.*

Якія элементы ўбору ў сармацкім партрэце падкрэслівалі высокі сацыяльны статус шляхціца?

**Новыя літаратурныя жанры**

барока. Ён супрацьпастаўляў волю і розум чалавека пачуццёваму пачатку быцця. Стыль барока праявіўся ў свецкім і рэлігійным, шляхецкім і народным мастацтве, што паспрыяла з'яўленню мастацкіх навацый, якія пераўтварылі аблічча культуры.

Высокі сацыяльны статус шляхты падкрэсліваўся раскошай і багаццем адзення. Багатыя і прыгожыя даспехі зрабіліся складовай часткай калекцый. Іх з гонарам дэманстравалі гасцям. Аксаміт, шоўк, тканіны, расшытыя золатам, дарагое футра выкарыстоўваліся ў строях шляхты настолькі шырока, што знешні выгляд паслоў Рэчы Паспалітай аднойчы ўразіў нават турэцкага султана.

У Заходняй Еўропе такі стыль адзення ўспрымаўся як усходні. Еўрапейцы эпохі барока цікавіліся ўсім экзатычным, пышным, а для шляхціца Рэчы Паспалітай, які прыязджаў у Заходнюю Еўропу, сармацкі строй быў сродкам самасцвярджэння. З яго дапамогаю шляхта вызначала сваю самабытнасць, этнічную і дзяржаўную прыналежнасць.

**2. Кніжная справа і літаратура.** У другой палове XVI — XVIII ст. на змену традыцыйнаму летапісанню прыйшлі новыя літаратурныя жанры: хранографы, сінапсісы, дыярыушы. Гэтыя творы апавядалі пра гістарычныя падзеі, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі, пра побыт шырокіх пластоў насельніцтва («Баркулабаўскі летапіс», другая палова XVI — пачатак XVII ст.), апісвалі жыццё шляхты («Дзённік Хведара Еўлашэўскага», 1603–1604 гг.).

## ЛІТАРАТУРНЫЯ ЖАНРЫ

| Сінапсісы | Хранографы | Дыярыушы |
| --- | --- | --- |
| кароткія істарычныя агляды | аб'ёмныя сваім зместам агляды сусветнай гісторыі | дзённікі |

**Выдавецкая справа**

Ад канца XVI і да сярэдзіны XVII ст. значную ролю ў выдавецкай справе адыгрывалі тыпаграфіі праваслаўных брацтваў. Тут былі апублікаваныя славянскія граматыкі Лаўрэнція Зізанія (1596 г.), Мялеція Смятрыцкага (1619 г.) і іншых аўтараў. Усяго да 1654 г. у ВКЛ пабачылі свет 17 рэдакцый кірылічных буквароў. Аднак у XVIII ст. сталіца ВКЛ Вільня перастала быць цэнтрам кірылічнага кнігадрукавання.

**Рэлігійна-палітычная палемічная публіцыстыка**

З нарастаннем міжрэлігійнай барацьбы ў выдавецкую справу ўключыліся каталіцкія і ўніяцкія ордэны. Сфарміравалася рэлігійна-палітычная палемічная публіцыстыка. У першай палове XVII ст. сярод каталіцкага кліру найбольшай папулярнасцю карысталіся творы Пятра Скаргі. Ідэйныя пазіцыі ўніятаў адстойвалі Язэп Руцкі і Леў Крэўза. Вялікі ўнёсак у развіццё праваслаўнай палемічнай літаратуры зрабілі Лявонцій Карповіч, Афанасій Філіповіч, Стэфан Зізаній і інш.

**Палітычная сатыра**

Новым жанрам беларускай літаратуры стала *палітычная сатыра*. Сярод найбольш яскравых твораў можна вылучыць «Прамову Мялешкі» і «Ліст да Абуховіча». Іх аўтары дасціпна парадыравалі чужаземцаў — немцаў і палякаў, высмейвалі сляпое

Яскравым прыкладам напалу рэлігійна-палітычнай палемікі з'яўляецца лёс твора Хрыстафора Філалета «Апакрысіс, або Адказ на кніжкі аб Берасцейскім саборы», апублікаванага ў 1597 г. у адказ на працы Пятра Скаргі.



*Тытульны аркуш кнігі Хрыстафора Філалета «Апакрысіс, або...». 1597 г.*

Як вы лічыце, чаму «Апакрысіс...» сістэматычна знішчалі ў Рэчы Паспалітай і праз 30 гадоў пасля публікацыі было ўжо складана знайсці друкаваны экзэмпляр гэтай кнігі?

пакланенне ім беларускай шляхты і адстойвалі палітычныя інтарэсы беларускіх зямель.

**Барока**

**3. Архітэктура.** Архітэктуру барока адрознівалі дынамічныя кампазіцыі, кантрасты маштабаў, матэрыялаў і фігур, выразныя святлоценевыя эфекты, ужыванне крывалінейных формаў і імкненне ствараць адчуванне бясконцасці прасторы.

**Класіцызм**

У 1770-я гг. паралельна з познім барока ў архітэктуры ВКЛ атрымаў пашырэнне класіцызм. Ён дэманстраваў ідэю разумнасці, упарадкаванасці, гарманічнасці быцця, кананізаваў антычную класіку як дасканалы ўзор. Магнаты і шляхта пачалі ствараць у сваіх маёнтках палацава-паркавыя ансамблі. У стылі класіцызму пабудаваныя палац Агінскіх у Слоніме, Тызенгаўза ў Гродне, Валовічаў у Свяцку, Храптовічаў у Шчорсах, Ружанскі палац — рэзідэнцыя князёў Сапегаў. Змяніліся прынцыпы горадабудаўніцтва. Гораду больш не патрабаваліся замкавыя абарончыя комплексы. Упарадкоўвалася вулічная сетка горада, узбуйняліся кварталы.




*Палацавы комплекс Сапегаў у Ружанах. Паштовая марка. 2017 г.*

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

*1. Успомніце, калі, у якім стылі і па загадзе якога князя быў пабудаваны Сафійскі сабор у Полацку.*

*2. Калі і пры якіх абставінах храм змяніў свой выгляд?*

*3. Назавіце асноўныя рысы стылю, у якім быў перабудаваны Сафійскі сабор у XVIII ст.*

*4. Падрыхтуйце творчы праект «Тысячагадовая гісторыя Полацкай Сафіі» ў адной з формаў: мультымедыйная прэзентацыя, буклет, відэаролік, постар і інш.*



*Сабор Святой Сафіі. Полацк*

# ПЕРЫЯДЫ РАЗВІЦЦЯ СТЫЛЮ БАРОКА Ў АРХІТЭКТУРЫ ВКЛ

## РАННЯЕ БАРОКА

Канец XVI — першая палова XVII ст.

**Замкі бастыённага тыпу**, выкарыстанне зямельных валоў і равоў, пяцівугольныя ўмацаванні крапасных муроў



*Нясвіжскі замак. Макет часоў першай паловы XVII ст.*

**Храм-базіліка** — цэнтральны неф вышэйшы за ўсе астатнія; галоўны фасад пляскаты з невялікім наборам дэкаратыўных элементаў



*Касцёл Божага Цела ў Нясвіжы. Срэбраная памятная манета Беларусі. 2005 г.*



*Богаяўленскі сабор. Малюнак. Магілёў. XIX ст.*

## СТАЛАЕ БАРОКА

Другая палова XVII ст. — 1730-я гг.

**Двухвежавая базіліка**: павялічылася колькасць ярусаў вежаў, фасад аздабляецца пластычнымі рашэннямі



*Касцёл св. Францыска Ксаверыя. Гродна. Фотаздымак. 1920–1930-я гг.*

## ПОЗНЯЕ БАРОКА (віленскае барока)

1730–1780-я гг.

Пластычнасць аб'ёму фасада, маляўнічасць сілуэта, мнагаярусныя ажурныя вежы, інтэр'еры ў стылі ракако — з дэкаратыўнымі элементамі і выкарыстаннем ляпніны



*Сафійскі сабор. Полацк. Малюнак. Мастак Н. Орда. Сярэдзіна XIX ст.*



*Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі. Аг. Будслаў. Мінская вобл.*

З якімі гістарычнымі падзеямі і сацыяльнымі працэсамі было звязана змяненне прынцыпаў горадабудаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII ст.?

**Манументальная скульптура**

**4. Выяўленчае мастацтва.** У перыяд барока ў ВКЛ з’явілася *манументальная скульптура*. Яна развівалася як мемарыяльная і алтарная. Першыя скульптурныя надмагіллі з’явіліся ў Вільні ў сярэдзіне XVI ст. Яны былі прысвечаны віленскаму біскупу Паўлу Гальшанскаму і канцлеру ВКЛ Альбрэхту Гаштольду. У канцы XVI — першай палове XVII ст. мемарыяльная скульптура зрабілася вельмі папулярнай сярод знаці.

Ад другой чвэрці XVII ст. пачала імкліва развівацца драўляная алтарная скульптура. Ствараючы яе, майстры звярталіся да гатычных узораў — так званага гатычнага барока. У першай палове XVII ст. шмат раннебарочных алтароў было створана ў цэрквах Волпы, Новай Мышы, Крамяніцы, Будслава. Большасць з іх была выраблена заходнееўрапейскімі майстрамі (нямецкімі, польскімі, італьянскімі) на заказ магнатаў — фундатараў храмаў.



*Драўляны разны алтар «Унебаўзяцце Марыі». XVII ст. Аг. Будслаў. Мінская вобласць*



*Іканастас. Смаленскі сабор Навадзевічага манастыра. Масква*

Разьба па дрэве

У XVII ст. узнікла *аб'ёмна-ажурная беларуская разьба па дрэве*, якая выкарыстоўвалася для ўпрыгажэння праваслаўных храмаў. Прыкладамі з'яўляюцца іканастас і царская брама Мікалаеўскай царквы ў Магілёве, выкананыя мясцовымі майстрамі. Характарам разьбы яны блізкія да іканастаса, выкананага для Смаленскага сабора Навадзевічага манастыра ў Маскве беларускімі майстрамі, сярод якіх працаваў і Клім Міхайлаў.

У першай траціне XVIII ст. сфарміравалася *віленская школа разьбы*. Алтарныя ансамблі ў гэтым стылі былі выкананы ў францысканскім касцёле Пінска і езуіцкім касцёле Гродна. Адметнымі рысамі скульптуры беларускага барока таго часу зрабіліся адсутнасць знешняй дынамікі і напругі, ураўнаважанасць і стрыманасць.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

Інтэнсіўна развівалася дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. У аздабленні палацаў і храмаў шырока ўжываліся рэльефная паліхромная кафля, мастацкае



*Францішка Уршуля Радзівіл. Гравюра на медзі. Гершка Лейбовіч. 1758 г.*

каванне, чаканка. Слуцкія паясы, карэліцкія габелены, урэцка-налібоцкае шкло, свержанскі і целяханскі фаянс атрымалі шырокую вядомасць у ВКЛ і па-за яго межамі.

Сфарміравалася беларуская школа гравюры на медзі. Праца з металам дазволіла мастакам мадэляваць аб'ём, дабівацца грання святла і ценю. Вядомымі майстрамі гравюры другой паловы XVII ст. былі Аляксандр Тарасевіч з Глуска, Максім Вашчанка з Магілёва.

**5. Музыка і прыгонны тэатр.** У музычным мастацтве XVI–XVII стст. найбольш разнастайныя па тэматыцы жанраў былі *канты* — многагалосныя вакальныя творы. Яны дзяліліся на лірычныя, сатырычныя, філасофскія гімны і псалмы (царкоўныя спевы). Канты распаўсюджваліся як вусна, так і пісьмова, праз рукапісныя і друкаваныя зборнікі. Гэты жанр уяўляў сабой унікальнае спалучэнне прафесійнай і народнай музыкі свайго часу.

**Месы, опера і балет**

У XVIII ст. слухачам прапаноўвалася музыка рознага прызначэння і спосабу выканання: вакальная (сольная і харавая), інструментальная (ансамблевая і аркестравая), вакальна-інструментальная. Найбольш запатрабаваным жанрам культавых і свецкіх мерапрыемстваў зрабіліся *месы* — цыклічныя творы з кананічным тэкстам. Атрымалі пашырэнне опера і балет. Лібрэта да оперных спектакляў стварала першая жанчына-пісьменнік Рэчы Паспалітай — Францішка Уршуля Радзівіл.

У Слуцку, Слоніме, Нясвіжы, Гродне і Шклове былі створаны балетныя і музычныя школы. Іх выпускнікі паспяхова выступалі на сцэнах варшаўскіх і пецярбургскіх тэатраў.

**Прыдворныя тэатры**

У рэзідэнцыях магнатаў з'явіліся прыдворныя тэатры. У пастаноўках спектакляў бралі ўдзел запрошаныя з-за мяжы прафесійныя артысты. Пры рэзідэнцыях магнатаў адкрываліся школы для навучання музыкантаў, артыстаў балета. Рэжысё-

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У 70-х гг. XVIII ст. у Слоніме Міхал Казімір Агінскі стварыў вялізны архітэктурны ансамбль. У яго ўвайшлі палац, манеж, аранжарэя, дамы для прыдворных і гасцей, тыпаграфія, тэатр, гаспадарчыя пабудовы, парк. Але галоўным стварэннем гетмана быў ягоны аркестр (адзін з найвялікшых у Еўропе таго часу), а таксама оперная і балетная трупы. Узведзены ў стылі барока тэатр — «Дом оперы» — размяшчаўся паміж палацам і адводным каналам, што цягнуўся ад р. Шчары. Вялікая сцэна тэатра была сканструявана паводле апошняга слова тэхнікі: яна магла запаўняцца вадой, і тады перад гледачамі плавалі сапраўдныя, а не бутафорскія чаўны. Дазваляла ўвасабляць найскладанейшыя спектаклі і балетныя пастаноўкі, тэатралізаваныя конныя баталіі і водныя феерыі.

1. *Чаму Слонім у тыя часы называлі «Палескімі Афінамі»?*
2. *Назавіце маёнткі на тэрыторыі Беларусі, дзе ў XVIII ст. былі таксама створаны прыдворныя тэатры.*
3. *Якую ролю тэатр адыгрываў у жыцці чалавека ў XVIII ст.? Ці змянілася яна ў сучасным грамадстве?*



*Слонімскі тэатр князя Міхала Казіміра Агінскага. Малюнак-рэканструкцыя*

рамі прыватных пастановак з'яўляліся замежныя драматургі.

У тэатральных пастаноўках часцяком брала ўдзел мясцовая шляхта. Так адбывалася таму, што тэатр зрабіўся часткай паўсядзённага жыцця магнатаў. Кожная падзея ў іх жыцці — ад нараджэння да смерці — суправаджалася пышнымі ўрачыстасцямі.

Школьны тэатр

**6. Народная культура.** У XVII–XVIII стст. у ВКЛ бурна развіваўся школьны тэатр — сцэнічныя пастаноўкі вучняў езуіцкіх калегіумаў і брацкіх школ. У 1787 г. на сцэне Забельскага дамініканскага калегіума была пастаўлена першая многаактовая беларуская «Камедыя» Каятана Марашэўскага. Яе цэнтральным персанажам выступіў беларускі селянін.

Батлейка

Развівалася батлейка — тэатр лялек, які спалучаў у сабе элементы народнага тэатра, фальклору і лялечнага прадстаўлення. У канцы XVIII — пачатку XIX ст. на Віцебшчыне з'явіўся батлеечны тэатр «Жлоб» (ад польскага «яслі»). Гэтая разнавіднасць батлейкі мела выгляд двух'яруснай трохкупальнай царквы і ўяўляла сабой своеасаблівы тэатр ценяў. У Еўропе канца XVIII — пачатку XIX ст. аналагаў такому тэатру не было.

Гістарычныя песні і паданні

З'яўляліся новыя эпічныя жанры — *гістарычныя песні* і *паданні* аб падзеях, бліжэйшых і жывейшых у памяці народа. Асноўным зместам героіка-гістарычнага эпасу зрабілася барацьба супраць прыгоннай няволі і нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту.

Іканапіс

У сярэдзіне XVII ст. у іканапісе, што прызначаўся для шырокіх народных мас, сфарміравалася барока. Іконы атрымалі разну́ю арнаментацыю, яны перадавалі натуральныя чалавечыя настроі (плач, радасць, смутак) і жыццёвыя сітуацыі (нараджэнне дзіцяці, пахаванне і інш.).

Прыкладам іконы барока з'яўляецца «Раства Багародзіцы». Аўтар падпісаў сваё імя — Пётр Яўсеевіч з Галынца. Ён выявіў на іконе падушкі з беларускім нацыянальным узорам, паказаў пейзаж за шыбай акна, бытавыя прадметы, якія этнаграфічна дакладна перадавалі жыццё Магілёўшчыны XVII ст.

**7. Працэсы паланізацыі на беларускіх землях.** Контррэфармацыя і ганенні на дысідэнтаў, выцясненне з афіцыйнага ўжытку беларускай мовы, сар-

мацкая ідэалогія надзвычай негатыўна паўплывалі на развіццё духоўнай культуры на тэрыторыі Беларусі. У розных галінах грамадскага жыцця ўзмацняліся працэсы **паланізацыі**.

Паланізацыя ў першую чаргу закранула найвышэйшую знаць і шляхту Беларусі. Пасля падпісання Люблінскай уніі гэты працэс узмацніўся. Усё больш трывалыя пазіцыі займала польская мова, якая была мовай каралеўскага двара і буйны́х землеўладальнікаў. Усходнеславянская знаць ВКЛ намагалася пераймаць польскую арыстакратыю, прычым не толькі яе мову, але і культуру, лад жыцця. У XVII–XVIII стст. паланізацыя закранула нават дробную шляхту, вярхушку мяшчанства, уніяцкае духавенства. У 1697 г. у афіцыйным справаводстве ВКЛ старабеларуская мова была замененая польскай.

**Паланізацыя** — запазычанне або насаджэнне польскай культуры і польскай мовы.

Якія фактары ўплывалі на развіццё беларускай культуры ў XVI–XVIII стст.?



*Ікона «Раства Багародзіцы». 1649 г. (Захоўваецца ў Нацыянальным музеі)*

*Напрыканцы XVIII ст. беларускае грамадства апынулася перад пагрозай поўнай страты сваёй эліты. Носьбітам беларускай мовы і традыцыйных каштоўнасцей беларускай культуры заставаўся народ — сяляне, значная частка мяшчанства, а таксама дробная шляхта. Яны зрабіліся галоўнай перашкодай для працэсаў культурнай асіміляцыі — поўнага прыняцця беларускім народам традыцый польскай культуры.*

| **калі ў свеце...** | **на тэрыторыі Беларусі...** |
| --- | --- |
| XVII–XVIII стст. — пашырэнне барока ў краінах Еўропы | XVII–XVIII стст. — панаванне стылю барока ў архітэктуры |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце праявы стылю барока на тэрыторыі Беларусі ў жывапісе, архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Прывядзіце найбольш яскравыя прыклады твораў.
2. Калі адбыўся пераход да класіцызму? Якія асаблівасці адрознівалі класіцызм ад мастацкага стылю барока?
3. Ахарактарызуйце развіццё літаратуры і кніжнай справы ў ВКЛ у XVII — першай палове XVIII ст.
4. Што б вы адказалі свайму суразмоўцу, які сцвярджае, што Вялікае Княства Літоўскае — самая тэатральная краіна Еўропы?
5. На аснове тэмы «Культура Беларусі ў другой палове XVI — XVIII ст.» сфармулюйце тры ключавыя вывады па вывучаным матэрыяле.